# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(476)

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., праф. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of the History of the Slavic Peoples*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

## ДАВЫД-ГАРАДОЦКАЯ АРДЫНАЦЫЯ РАДЗІВІЛАЎ У XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*На падставе архіўных дакументаў прааналізаваны агульны стан і гаспадарчая дзейнасць Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў, аднаго з самых буйных прыватных землеўладанняў на Палессі ў XIX – пачатку XX ст. Паказаны працэс утварэння самастойнай ардынацыі. У 1875–1904 гг. нясвіжскі ардынат Антоній Вільгельм Радзівіл аб'ядноўваў усе тры ардынацыі – Нясвіжскую, Клецкую і Давыд-Гарадоцкую. Аднак закладанне ў 1885 г. парка ў Манькавічах стала пачаткам працэсу ўтварэння самастойнай Давыд-Гарадоцкай ардынацыі. Пераход у 1905 г. кіраўніцтва да Станіслава Радзівіла, першага давыд-гарадоцкага ардыната, узвядзенне палаца ў Манькавічах сталі сведчаннямі набыцця самастойнасці ардынацыі дэ-юрэ. Маёнткі і фальваркі ардынацыі былі заняты пераважна ў сельскай і ляснной галінах. Пры нязначнай плошчы ворных зямель змяншаўся прыбытак, таму паступова згортвалася сельскагаспадарчая вытворчасць, павялічвалася здача зямельных і лясных надзелаў у арэнду, узрастала высечка лесу. У артыкуле паказаны таксама складаныя ўзаемаадносіны паміж адміністрацыяй ардынацыі і мясцовымі сялянамі.*
***Ключавыя словы:*** *Радзівілы, ардынацыя, Давыд-Гарадок, маёнткі, фальваркі, судовыя іскі.*

### *The Radziwills Davyd-Haradok Ordination in the XIXth – Early 20th Centuries*

*On the basis of archival documents, the author analyzed the general condition and economic activities of the Davyd-Haradok ordination of the Radziwills, one of the largest private land holdings in Palessie in the IXIth – early XXth centuries. The process of forming an independent ordination is also shown. In 1875–1904 Niasvizh ordinate Antonij Vilhelm Radzivil united all 3 ordinations – Niasvizh, Kleck and Davyd-Haradok. However, the laying of a park in Mankavichy in 1885 marked the beginning of the process of the formation of an independent Davyd-Haradok Ordination. In 1905, the transfer of leadership to Stanislaw Radzivil, the first Davyd-Haradok ordinate, the construction of the palace in Mankavichy became evidence of the acquisition of independence of the de jure ordination. Estates and farms of the Ordination were mainly used in agriculture and forestry. With an insignificant area of arable land, the profit fell, therefore, agricultural production was gradually curtailed, the leasing of land and forest allotments increased. Deforestation increased significantly. The difficult relationship between the administration of the ordination and local peasants is revealed.*
***Key words:*** *Radzivils, ordination, Davyd-Haradok, estates, farmsteads, lawsuits.*

### Уводзіны

Ардынацыя – гэта непадзельная і неадчужальная ўласнасць (землі, лясы, гарады, мястэчкі, вёскі, мануфактуры) пэўнага магнацкага роду ў Рэчы Паспалітай, якая пераходзіла да старэйшага нашчадка старэйшай мужчынскай лініі [1]. У 1586 г. кароль Стэфан Баторый зацвердзіў пагадненне братоў Мікалая Крыштафа, Альбрэхта і Станіслава Радзівілаў, якое паклала пачатак тром іх родавым ардынацыям – Нясвіжскай, Клецкай і Алыцкай. У 1641 г. была заснавана Давыд-Гарадоцкая ардынацыя, якая не з'ўлялася самастойнай і была злучана з Клецкай. Радзівілаўскія ардынацыі працягвалі існаваць у Расійскай імперыі і Польскай дзяржаве (да 1939 г.). Большасць тэрыторыі былой Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў уваходзіць цяпер у склад Беларусі (паўднёва-ўсходняя частка Брэсцкай вобласці – пераважна Столінскі раён), меншыя абшары – у склад Украіны (памежная паўночна-ўсходняя частка Ровенскай вобласці).

Гісторыі роду Радзівілаў прысвечана ўжо даволі шмат даследаванняў у замежнай і айчыннай гістарычнай навуцы. З ардына-

цый Радзівілаў найбольшая ўвага нададзена менавіта Нясвіжскай, Клецкай і Алыцкай ардынацыям. Асобныя аспекты ці перыяды гісторыі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі закрануты толькі некаторымі навукоўцамі. Польскі даследчык замкаў і сядзібаў Р. Афтаназы ажыццявіў гісторыка-архітэктурнае апісанне палаца ў Манькавічах, які быў у 1905–1939 гг. цэнтрам Давыд-Гарадоцкай ардынацыі [2, с. 71–78]. Сярод беларускіх вучоных, якія займаюцца радзівілазнаўствам, варта адзначыць В. Папко. Асобны яе артыкул прысвечаны гісторыі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі напярэдадні Першай сусветнай вайны і ў міжваенны час [3]. У іншых публікацыях яна асвятляла арганізацыю паляванняў у ардынацыях Радзівілаў, падзел іх родавай спадчыны [4–5]. У дысертацыі В. Кахновіча разгледжана гаспадарчае развіццё памешчыцкіх маёнткаў (у тым ліку і Радзівілаў) на Палессі ў парэформенны перыяд у Расійскай імперыі ў 1864–1914 гг. [6]. Стан гаспадаркі Радзівілаў закрануты ў яго артыкулах, аўтарскай і калектыўнай манаграфіях [7–9].

У працы А. Федарука пра старажытныя сядзібы Берасцейшчыны ўтрымліваецца кароткі агляд гісторыі, апісанне архітэктурных адметнасцей палаца і парка ў Манькавічах [10, с. 538–544]. Асобныя аспекты гісторыі, стану палацава-паркавага ансамбля ў Манькавічах выкладзены Л. Несцярчуком [11, с. 306–308].

Аўтар дадзенага артыкула ў сваіх папярэдніх даследаваннях засяроджваў увагу на функцыянаванні Давыд-Гарадоцкай ардынацыі пераважна ў складзе Польскай дзяржавы ў 1921–1939 гг. [12–16]. Ранейшыя перыяды яе гісторыі мелі больш аглядавае асвятленне. Таму мэтай артыкула з’яўляецца раскрыццё стану, асноўных напрамкаў гаспадарчай дзейнасці Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў, узаемаадносін яе адміністрацыі з сялянамі ў XIX – пачатку XX стст. Для гэтага выкарыстаны цэлы шэраг дакументальных матэрыялаў з айчынных і замежных архіўных устаноў.

**Асноўная частка**

Пасля ўтварэння ў 1586 г. Нясвіжскай, Клецкай і Алыцкай ардынацый Радзівілаў землі былога Давыд-Гарадоцкага княства ўвайшлі ў склад Клецкай ардынацыі, якая ўключала і Давыд-Гарадоцкую, што не з’яўлялася самастойнай. У ходзе аналізу архіўных дакументаў намі ўстаноўлена, што паводле рэвізіі 1795 г. ва ўладаннях Давыд-Гарадоцкай ардынацыі ў Мазырскім павеце Мінскай губерні налічвалася 4 567 рэвізскіх (мужчынскіх) душ (мястэчка Давыд-Гарадок, а таксама вёскі Альшаны, Малешава, Беразцы, Блежова, Гліннае, Бярозаў, Драздынь, Старое Сяло, Пераходзічы, Пераброды, Лядзец, Харомск, Туры, Рубель (Любра), Хорск, Велямічы); у Пінскім павеце – 1 051 (вёскі Манькавічы, Белавуша, Альманы, Вікаравічы, Атвержычы, Хотамель, Вялікія Арлы). З уладанняў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў у 1810 г. адыйшла в. Сямігосцічы Мазырскага павета (66 душ), у 1811 г. – в. Малыя Арлы Пінскага павету (145 душ). Паводле рэвізіі 1811 г. у Мазырскім павеце было зафіксавана 4 280 душ, у Пінскім – 958 душ. Найбольшая колькасць рэвізскіх душ прыходзілася на мястэчка Давыд-Гарадок (1 474), вёскі Альшаны (490), Лядзец (207), Велямічы (246), Рубель (205), Белавуша (293) [17, арк. 211–212].

Згодна з інвентаром 1835 г. фальварка Вялікія Арлы прыгонныя сяляне в. Вялікія Арлы выконвалі наступныя павіннасці: *«Адбываць паншчыны ў тыдзень адпаведна з валоданнем зямлі па 3 дні і 2 з хаты, аб чым двор загадае... Чынш выплачваецца штогод на св. Марціна восенню»*. Сяляне вёскі Рубель у сваю чаргу: паншчыны *«ў тыдзень на працягу кожнага году, аб чым двор загадае, з дыму па 2 дні»*, згаданы штогадовы чынш восенню (на св. Марціна), *«дзякла разам ссыпаць двару таксама штогод, жыта 16 бочак (кадушак) 2 асьміны, аўса столькі ж»*. Акрамя таго, сяляне дзвюх вёсак прыцягваліся сем’ямі да гвалтаў – *«на ўборку збожжа і ўборку сена штогод адбываюць па 3, ад кожнай рабочай асобы, пачынаючы ад 15 да 50 гадоў»*, займаліся праполкай агародаў панскага двара і пшаніцы па 4 дні, ноччу вартавалі панскі двор па чарзе, вартавалі паром па чарзе з дзвюх вёсак, штогод плацілі даніну (куры, грыбы, мяхі і сена), дастаўлялі кожную восень авёс у леснічоўкі па квіту давыд-гарадоцкага лоўчага, выходзілі па 1 чалавеку на аблавы ў час палявання князя, *«шарваркаў дванаццаць з кожнага дыму у год, толькі назначаецца для рамонту дваровых будынкаў, корчмаў, грэбляў, мастоў, млыноў і т.п.»* і інш. [18, арк. 13адв.].

Пасля князя Міхаіла Гераніма Радзівіла наступным клецкім ардынатам стаў яго сын Людвік Мікалай Радзівіл, а пасля яго смерці ў 1830 г. – яго сын Леон (Леў) Радзівіл, генерал-ад'ютант расійскай царскай арміі, які знаходзіўся на дыпламатычнай службе. Безумоўна, непасрэдна кіраўніцтвам Давыд-Гарадоцкай ардынацыяй па яго даручэнні займалася адміністрацыя.

1 кастрычніка 1834 г. быў зацверджаны даклад камісіі аб Клецкай і Давыд-Гарадоцкай ардынацыях, паводле якога *«отчужденные разными владельцами ординацкие земли и имения возвратить князю Льву Радзивиллу»*. Пры выкананні гэтага распараджэння некаторыя землі ў мясцовых дваранаў (шляхты), мяшчанаў і нават духавенства былі забраны і перададзены Л. Радзівілу. Гэта прывяло да цэлага шэрагу канфліктаў і спрэчак, судовых разбіральніцтваў, якія не заўсёды вырашаліся на карысць ардынацыі. У прыватнасці, на дзеянні выканаўчай улады былі пададзены скаргі ў Пецярбург у Сенат, які прызнаў, што камісія аб Клецкай і Давыд-Гарадоцкай ардынацыі не разглядала дакументаў на *«право вотчинничества»* скаржнікаў. Заключэнне Сената было зацверджана 12 чэрвеня 1842 г. Дзяржаўным Саветам. Указ Сената ад 7 ліпеня 1842 г. прадпісваў Мінскаму губернскаму праўленню яго выкананне. Жыхары вёсак Альпень і Рубель на падставе гэтага рашэння аб прыналежнасці ім зямель склалі агульны судовы іск. Паводле яго 27 кастрычніка 1859 г. Мінская грамадзянская палата прыняла рашэнне, аднак пасля апеляцыі павераных жыхароў названых вёсак яно было адменена ўказам Сената ад 8 студзеня 1864 г.: зямля, якой валодалі жыхары Альпеня і Рубля, пакінута ім па праву поўнай уласнасці [19, арк. 11–11адв.].

Пасля адмены ў 1861 г. прыгоннага права характар узаемаадносін паміж адміністрацыяй ардынацыі і сялянамі стаў больш напружаным, асабліва ў сувязі са складваннем выкупных актаў. Акрамя таго, захаванне сервітутаў, цераспалосіцы з суседнімі шматлікімі гаспадаркамі дробнай шляхты (дваранства), мяшчан і сялян таксама ўскладняла ўзаемаадносіны. Нярэдка на землях і ў лясах ардынацыі адбываліся патравы, самавольны выпас жывёлы, пакос лугоў, высечка лесу, браканьерства і інш.

Большая частка сялян беларускіх зямель перайшла да выкупу да пачатку 1870-х гг. [20, с. 164]. Аднак на поўдні Мінскай губерні сяляне яшчэ доўга змагаліся з памешчыкамі за спрэчныя землі. Гэта адбывалася і ў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў. На працягу 1865–1872 гг. былі зацверджаны выкупныя акты ў памесцях ардынацыі: Альманская Кашара (вёскі Альманы, Пераходзічы, Пераброды), Драздынь (вёскі Драздынь, Старое Сяло), Юзэфін (вёскі Гліннае, Блежова, Бярозаў), Вялікія Арлы (сяло Рубель), Высокае (вёскі Малешава, Альшаны, Велямічы), Давыд-Гарадок (мястэчка Давыд-Гарадок, вёскі Хорск, Харомск, Туры), Беразцы (в. Беразцы), Манькавічы (вёскі Манькавічы, Белавуша, Вялікія Вікаравічы, Атвержычы, Хотамель) і інш. [21, арк. 13адв.–15; 22, арк. 16–17, 20адв.–21, 24, 28, 34; 23, арк. 2–3].

У асобных мясцовасцях урэгуляванне спрэчных пытанняў расцягнулася на многія дзесяцігоддзі. Так, 18 лістапада 1865 г. праверачная камісія высветліла, што ў сялян в. Хотамель былі наступныя нязручнасці: *«дурное качество усадеб, огородов и выпуска, недостаток и неудовлетворительное качество пастбищ, неимение топлива, разбросанность и отдаленность пахотных и сенокосных угодий, подвергаемых затоплению, удаление от торговых мест и затруднительность в приискании заработков и нищенское состояние крестьянских хат»* [22, арк. 5]. Таму разрад зямлі зменшылі на 3 ступені – да 36 кап. за дзесяціну. Пры такой цане кожнаму сялянскаму двару за зямельны надзел у 16 дзесяцін 1 507 кв. сажняў, з якіх выключаліся 4 дзесяціны 406 кв. сажняў, што не абкладаліся павіннасцямі, штогадовы выкупны плацёж складаў 4 руб. 48 ½ кап.

У в. Манькавічы праверачная камісія ўстанавіла, што *«пахотные поля все песчаные, в озимом сеют одну рожь с[о] средним урожаем в 1 ½ зерна… Крестьяне указали на совершенную бедность их построек, низменное расположение огородов, заливаемых в большую воду на равных с сенокосами и неимение зоробтков, кроме найма на сплавы»* [22, арк. 41–41адв.]. Пры гэтым для сялян усіх вёсак памесця Манькавічы дазволілі *«право пастьбы скота: летом по лесам и болотам владельца; весною и осенью – по его же сенокосам»*. Аднак га-

лоўны ўпраўляючы памесця скардзіўся на такія рашэнні праверачнай камісіі [24; 22, арк. 16адв.].

Спрэчка сялян в. Альманы была спынена па добраахвотнай дамове 19 верасня 1892 г. Усе землі, якія знаходзіліся ў безумоўным валоданні сялян, сталі іх надзеламі. Аднак сяляне былі незадаволены адмежаваннем пашы па сервітуту. Пінскі павятовы з'езд 18 верасня 1910 г. вырашыў зацвердзіць межавыя дакументы. Павераныя сялян прасілі прадоўжыць ім тэрмін абскарджвання гэтага рашэння [23, арк. 163адв.]. Скарга павераных сялян в. Альманы Дзмітрыя Дзенісовіча і Сцяпана Буяна аб адмежаванні сялянскіх зямель гэтай вёскі ад зямель памесця Альманская Кашара князя Радзівіла разглядалася 29 студзеня 1913 г. Мінскай губернскай прысутнасцю па сялянскіх справах. Аднак кропку ў справе паставіў Сенат, які Указам ад 7 мая 1915 г. прызнаў *«настоящую жалобу просителей не заслуживающей уважения»* [23, арк. 167адв.].

Гаспадарка Радзівілаўскай ардынацыі мела экстэнсіўны характар, не была рэнтабельнай. Пераважную частку зямельных уладанняў ардынацыі складалі няўдобіцы (балоты) і лясы. Ворыўная зямля займала мізэрную частку ад усёй тэрыторыі. Ураджайнасць у фальварках Давыд-Гарадоцкай ардынацыі (Давыд-Гарадок, Высокае, Добрынь, Лісовічы) у 1889–1890 г. складала 37,8 ц/га азімага жыта, 20,1 ц/га азімай пшаніцы, 30,2 ц/га ячменю, 12,6 ц/га аўса, 176,3 ц/га бульбы [8, с. 300]. Як і іншыя памешчыцкія гаспадаркі, ардынацыя прыстасоўвалася да капіталістычных умоў гаспадарання: скарачаліся пасяўныя плошчы, значная частка зямлі здавалася ў арэнду.

Асноўным артыкулам прыбыткаў становіцца продаж драўніны. У канцы XIX – пачатку XX ст. у фальварках Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў разгарнулася масавая высечка лясоў. Напрыклад, паводле двух кантрактаў 1892 г., заключаных з берлінскім купцом Францам Краўзэ, прадугледжваўся продаж драўніны з лясоў Нясвіжскай і Давыд-Гарадоцкай ардынацый. Паводле першага кантракту былі прададзены 160 тыс. штук дрэў з Акінчыцкіх, Арлікоўскіх, Морацкіх і Дзяніскавіцкіх лясоў на суму 400 тыс. руб. і з Давыд-Гарадоцкіх лясоў – на 150 тыс. руб. Другі кантракт з Ф. Краўзэ прадугледжваў закуп дрэва з Давыд-Гарадоцкіх лясоў на агульную суму 150 тыс. руб.: на 60 тыс. руб. альхі па 37 кап. за 1 м$^3$ і іншых лісцяных дрэваў – на 15 тыс. руб., а таксама на 75 тыс. руб. сасновых шпалаў і інш. [25, арк. 1]. У пачатку XX ст. лясная гаспадарка давала амаль палову прыбыткаў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі.

Асобныя землі ардынацыі былі прададзены яшчэ раней. Так, памесце Драздынь Мазырскага павета (259 дзесяцін 670 кв. сажняў зямлі з будынкамі) з-за дзяржаўных і прыватных даўгоў у 1881 г. было выстаўлена на публічныя таргі. Новым уладальнікам памесця Драздынь у чэрвені 1881 г. стаў калежскі сакратар Леанід Аляксандравіч Ульянаў, які набыў яго за 800 руб. [26, арк. 1–3, 6].

23 ліпеня 1874 г. было заключана пагадненне, паводле якога Леў Радзівіл перадаў усе маёнткі Антонію Вільгельму Радзівілу, палкоўніку прускай арміі, які жыў у Берліне. *«Я, Лев Радзивилл, передав Антону Радзивиллу все без исключения имения Клецкой и Давидгородецкой ординации, а также вотчинные, на основании особой доверенности, предоставляю ему право распоряжаться и управлять имениями этими и делами к оным относящимися безотчетно и без всякого с чьей-либо стороны вмешательства. Я же, Антон Радзивилл, обязываюсь уплачивать Князю Льву Радзивиллу в сроки 1-го октября, 1-го января, 1-го апреля и 1-го июля по 9 000 руб. на каждый срок, что составит тридцать шесть тысяч руб. сер[ебром] 36 000 руб. сер[ебром]. Удовлетворение всех долгов и взыскании казенных и частных относиться ко мне, Антону Радзивиллу, то есть к доходам управляемых имений, не обременяя таковыми меня и имений мне лично принадлежавших до времени перехода, по предположению, упомянутых имений Князя Льва Радзивилла в собственность мою»* [27, s. 4–5].

Пасля Указа Аляксандра II ад 23 студзеня 1875 г., які зацвердзіў гэты пераход уладанняў, 27 лютага 1875 г. Леў Радзівіл і Антоній Радзівіл падпісалі асобны дагавор, у якім пацвердзілі заключанае пагадненне [27, s. 18–20]. Такім чынам, уладанні Клецкай і Давыд-Гарадоцкай ардынацый былі аб'яднаны разам з Нясвіжскай ардынацыяй пад кіраўніцтвам XIV нясвіжскага ардыната Антонія Вільгельма Радзівіла.

У верасні 1881 г. Антоній Радзівіл праз свайго паверанага перадаў надворнаму саветніку Сігізмунду Ігнатавічу Керсноўскаму пасведчанне на права куплі для князя памесцяў у Паўночна-Заходнім краі і даручыў *«приобретать на имя его аллоидальные имения князя Льва Людвиговича Радзивилла, а именно: Чудзин, Дроздынь и Глинное, а также... имение Дроздынь... продано уже с публичных торгов другому лицу»* [26, арк. 1–3, 6]. І ў 1882 г. памесце Драздынь было набыта ва ўладанне князя А. Радзівіла за 1 500 руб. [28].

У 1880-я гг. пры Антоніі Радзівіле, які фармальна лічыўся і ХІ давыд-гарадоцкім ардынатам, пачалася праца па вылучэнні Давыд-Гарадоцкай ардынацыі ў якасці самастойнай. У 1885 г. па ініцыятыве яго жонкі Марыі Дароты дэ Кастэлян быў закладзены парк у Манькавічах каля Століна на высокім левым беразе ракі Гарынь. Парк складаўся з цэнтральнай пейзажнай часткі, падзеленай алеямі, і натуральнага масіву дрэў па перыметры. Большая частка парка была зроблена ў англійскім ландшафтна-рамантычным стылі [11, с. 21].

У 1902–1905 гг. па праекце берлінскага архітэктара Венцэля ў Манькавічах быў пабудаваны палац [29, арк. 254]. Увесь палацава-паркавы ансамбль у Манькавічах меў мастацка-стылявое падабенства з Нясвіжскай рэзідэнцыяй Радзівілаў, быў вельмі ўдала ўпісаны ў натуральны ландшафт. У галоўным корпусе палаца цэнтральную яго частку займаў вялікі вестыбюль на ўсю вышыню будынка. Побач з вестыбюлем была размешчана вялікая зала, квадратная ў плане, да якой з двух бакоў прылягалі меншыя залы. З правага боку да вестыбюля прымыкала бібліятэка, з левага – сталоўка. У пакоях, якія высоўваліся справа і злева фасадным рызалітам, былі адпаведна хатняя капліца і буфет. У галоўным корпусе былі таксама іншыя жылыя і службовыя памяшканні. У палацавай бібліятэцы захоўваліся выданні, якія падараваў Марыі Дароце дэ Кастэлян нясвіжскі архівіст, сын віленскага кнігавыдаўца Ю. Завадскага: кнігі А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, А. Снядэцкага і інш. [2, s. 75; 10, с. 539–540]. На наш погляд, закладанне парка ў Манькавічах, з якога ішла далейшая разбудова палацава-паркавага ансабля, трэба разглядаць у якасці пачатковай праявы ўтварэння дэ-факта самастойнай Давыд-Гарадоцкай ардынацыі.

Пасля смерці ў 1904 г. князя А. Радзівіла Давыд-Гарадоцкая ардынацыя перайшла па спадчыне да яго малодшага сына Станіслава Радзівіла (ХІІ давыд-гарадоцкага ардыната, хаця фактычна ён быў першым кіраўніком самастойнай ардынацыі) [3, с. 32]). Такім чынам, з 1905 г. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя Радзівілаў стала ўжо самастойнай дэ-юрэ. Аднак у час Першай сусветнай вайны ардынацыя панесла велізарныя страты: моцна быў разбураны палац у Манькавічах, загінулі яго мастацкія каштоўнасці. Пасля гібелі 28 красавіка 1920 г. у час польска-савецкай вайны С. Радзівіла апошнім (ХІІІ, а фактычна другім самастойным) давыд-гарадоцкім ардынатам стаў яго пляменнік Караль Мікалай Радзівіл.

**Заключэнне**

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі з канца XVIII ст. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя Радзівілаў заставалася велізарнай памешчыцкай латыфундыяй у Мазырскім і Пінскім паветах Мінскай губерні. Да пачатку ХХ ст. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя не з'яўлялася самастойнай, а існавала разам з Клецкай ардынацыяй. У 1875 г. клецкі і давыд-гарадоцкі ардынат Леў Радзівіл добраахвотна перадаў усе ўладанні на тэрыторыі гэтых дзвюх ардынацый нясвіжскаму ардынату Антонію Вільгельму Радзівілу, атрымаўшы штогадовае пажыццёвае ўтрыманне – 36 тыс. руб. Такім чынам ва ўласнасці А. Радзівіла былі аб'яднаны ў 1875–1904 гг. Нясвіжская, Клецкая і Давыд-Гарадоцкая ардынацыі. Аднак менавіта ў гэты перыяд пачалася праца па стварэнні самастойнай Давыд-Гарадоцкай ардынацыі. Паводле нашых меркаванняў, закладанне ў 1885 г. парка ў Манькавічах трэба разглядаць як пачатак працэсу ўтварэння самастойнай дэ-факта Давыд-Гарадоцкай ардынацыі, а пераход у 1905 г. яе кіраўніцтва і валодання да Станіслава Радзівіла, першага паўнавартаснага давыд-гарадоцкага ардыната, і ўзвядзенне палаца ў Манькавічах сталі сведчаннем набыцця самастойнасці ардынацыі дэ-юрэ.

Маёнткі і фальваркі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі займаліся дзейнасцю пераважна ў сельскагаспадарчай і лясной галінах. Аднак іх прыбытковасць падала. Таму

пры нязначнай долі ворных зямель паступова згортвалася сельскагаспадарчая вытворчасць, павялічвалася здача зямельных і лясных надзелаў у арэнду. Велізарныя плошчы лясоў высякалі. У пачатку XX ст. амаль палову прыбыткаў ардынацыі давала якраз лясная гаспадарка.

З-за адчужэння часткі сялянскіх зямель паміж адміністрацыяй ардынацыі і сялянамі ўзнікалі канфлікты і судовыя разбіральніцтвы. Узаемаадносіны сталі больш напружанымі пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г., калі пачалі складвацца выкупныя акты. Урэгуляванне гэтых спрэчак расцягвалася на цэлыя дзесяцігоддзі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Грыцкевіч, А. П. Ардынацыя / А. П. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 1. – 1993. – С. 150.

2. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnich kresach Rzeczypospolitej. – 2-e wyd. – T. 2 / Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wrocław [etc.] : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1993. – 472 s.

3. Папко, В. М. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя князёў Радзівілаў у 1905–1939 гг. / В. М. Папко // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2011. – № 2. – С. 32–40.

4. Папко, В. Арганізацыя паляванняў у ардынацыях князёў Радзівілаў у канцы XIX – пачатку XX ст. / В. Папко // Беларус. гіст. часоп. – 2010. – № 8. – С. 13–19.

5. Папко, В. Падзел спадчыны роду князёў Радзівілаў у 1905–1935 гадах / В. Папко // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 10. – С. 26–35.

6. Кахновіч, В. А. Гаспадаранне ў маёнтках Палескага рэгіёну Расійскай імперыі ў 1861–1914 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.03 / В. А. Кахновіч ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2010. – 22 с.

7. Кохнович, В. А. Хозяйство и доходы Радзивиллов в XIX – начале XX ст. / В. А. Кохнович // КЛИО. – 2012. – № 4. – С. 46–54.

8. Кохнович, В. Хозяйство в имениях на Полесье в 1861–1914 гг. / В. Кохнович. – Saarbrücken : Lambert Academic Publishing, 2015. – 358 с.

9. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш. ] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 682 с. ; 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2023. – 682 с.

10. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2004. – 576 с.

11. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 336 с.

12. Вабішчэвіч, А. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя Радзівілаў у 1921–1939 гг. / А. Вабішчэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 2015. – № 10. – С. 20–33.

13. Вабищевич, А. Усадьба Радзивиллов в Маньковичах / А. Вабищевич // Radziwiłłowe. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / red. K. Stępnik. – Lublin : Wydaw. Un-tu Marii Curie-Skłodowskiej, 2003. – S. 455–463.

14. Вабищевич, А. Н. Функционирование крупных частновладельческих хозяйств в западнобелорусском регионе в 1921–1939 гг. (на примере Давид-Городокской ординации Радзивиллов) / А. Н. Вабищевич // Правовые, управленческие и гуманитарные проблемы деятельности государственных структур и хозяйствующих субъектов: российский и международный опыт : материалы X Междунар. научно-практ. конф. 2015 г. – М. : Элит, 2015. – С. 532–539.

15. Вабішчэвіч, А. М. Гісторыка-культурная спадчына Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў: стан, перспектывы выкарыстання / А. М. Вабішчэвіч // Проблемы рационального использования природных ресурсов и устойчивое развитие Полесья : сб. докл. Междунар. науч. конф., Минск, 14–17 сент. 2016 г. : в 2 т. / редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2016. – Т. 2. – С. 496–500.

16. Вабішчэвіч, А. М. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя Радзівілаў: гістарычная спадчына і сучаснасць / А. М. Вабішчэвіч // Олика та Радзивілли в історії України, Польщі й Білорусі : зб. наук. пр. / уклад. Л. А. Понєдєльник. – Луцьк : Вежа-Друк, 2018. – С. 171–182.

17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1740.
18. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 6055.
19. НГАБ. – Ф. 147. Воп. 3. Спр. 12148.
20. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2011. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.
21. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 2. Спр. 1565.
22. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 2. Спр. 825.
23. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 2. Спр. 770.
24. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 2. Спр. 758.
25. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 5626.
26. НГАБ. – Ф. 147. Воп. 3. Спр. 30909.
27. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – Zespół 354. Dział XI. Sygnatura 305.
28. НГАБ. – Ф. 147. Воп. 3. Спр. 31332.
29. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 2031. Воп. 2. Спр. 2568.

REFERENCES

1. Hryckievich, A. P. Ardynacyja / A. P. Hryckievich // Encyklapiedyja historyi Bielarusi : u 6 t. – Minsk : BielEn,1993–2003. – T. 1. – 1993. – S. 150.
2. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnich kresach Rzeczypospolitej. – 2-e wyd. – T. 2 / Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wrocław [etc.] : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1993. – 472 s.
3. Papko, V. M. Davyd-Haradockaja ardynacyja kniaziou Radzivilau u 1905–1939 hh. / V. M. Papko // Viesn. Bresc. un-ta. Sier. 2, Historyja. Ekanomika. Prava. – 2011. – № 2. – S. 32–40.
4. Papko, V. Arhanizacyja paliavanniau u ardynacyjakh kniaziou Radzivilau u kancy XIX – pachatku XX st. / V. Papko // Bielarus. hist. chasop. – 2010. – № 8. – S. 13–19.
5/ Papko, V. Padziel spadchyny rodu kniaziou Radzivilau u 1905–1935 hadakh / V. Papko // Bielarus. hist. chasop. – 2011. – № 10. – S. 26–35.
6. Kakhnovich, V. A. Haspadarannie u majontkakh Palieskaha rehijonu Rasijskaj impieryi u 1861–1914 hh. : autaref. dys. … kand. hist. navuk : 07.00.03 / V. A. Kakhnovich ; Bielarus. dziarzh. un-t. – Minsk, 2010. – 22 s.
7. Kokhnovich, V. A. Khoziajstvo i dokhody Radzivillov v XIX – nachalie XX st. / V. A. Kokhnovich // KLIO. – 2012. – № 4. – S. 46–54.
8. Kokhnovich, V. Khoziajstvo v imienijakh na Polies'je v 1861–1914 gg. / V. Kokhnovich // Saarbrücken : Lambert Academic Publishing, 2015. – 358 s.
9. Sacyjal'na-ekanamichnaje razviccio Bielarusi (kaniec XVIII – pachatak XX st.) / V. V. Yanouskaya [i insh.] ; redkal.: V. V. Danilovich (hal. red.) [i insh.] ; NAN Bielarusi, In-t historyi. – Minsk : Bielarus. navuka, 2020. – 682 s. ; 2-je vyd. – Minsk : Bielarus. navuka, 2023. – 682 s.
10. Fiedoruk, A. T. Starinnyje usad'by Bieriestiejshchiny / A. T. Fiedoruk. – Minsk : BielEn, 2004.– 576 s.
11. Niesciarchuk, L. M. Zamki, palacy, parki Bierasciejshchyny X–XX stahoddziau (historyja, stan, pierspiektyvy) / L. M. Niesciarchuk. – Minsk : BELTA, 2002. – 336 s.
12. Vabishchevich, A. Davyd-Haradockaja ardynacyja Radzivilau u 1921–1939 hh. / A. Vabishchevich // Bielarus. hist. chasop. – 2015. – № 10. – S. 20–33.
13. Vabishchievich, A. Usad'ba Radzivillov v Man'kovichakh / A. Vabishchievich // Radziwiłłowe. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / red. K. Stępnik. – Lublin : Wydaw. Un-tu Marii Curie-Skłodowskiej, 2003. – S. 455–463.
14. Vabishchievich, A. N. Funkcionirovanije krupnykh chastnovladiel'cheiskikh khoziajstv v zapadnobielorusskom rioegione v 1921–1939 gg. (na primierie David-Gorodokskoj ordinacii Radzivillov) / A. N. Vabishchievich // Pravovyje, upravlienchieskije i gumanitarnyje probliemy diejatiel'nosti gosudarstviennykh struktur i khoziajstvujushchikh subjektov: rossiyskij i mezhdunarodnyj opyt : materialy X Mezhdunar. nauchno-prakt. konf. 2015 g. – M. : Elit, 2015. – S. 532–539.

15. Vabishchevich, A. M. Historyka-kul'turnaja spadchyna Davyd-Haradockaj ardynacyji Radzivilaw: stan, pierspiektyvy vykarystannia / A. M. Vabishchevich // Probliemy racional'nogo ispol'zovanija prirodnykh riesursov i ustojchivoje razvitije Polies'ja : sb. dokl. Miezhdunar. nauch. konf., Minsk, 14–17 sient. 2016 g. : v 2 t. / redkol.: V. G. Gusakov (gl. ried.) [i dr.]. – Minsk : Bielarus. navuka, 2016. – T. 2. – S. 496–500.

16. Vabishchevich, A. M. Davyd-Haradockaja ardynacyja Radzivilau: histarychnaja spadchyna i suchasnasc' / A. M. Vabishchevich // Olyka ta Radzyvilly v istoriji Ukrajiny, Pol'shchi i Bilorusi : zb. nauk. pr. / uklad. L. A. Poniediel'nyk. – Luc'k : Viezha-Druk, 2018. – S. 171–182.

17. Nacyjanal'ny histarychny arkhiu Bielarusi (NHAB). – F. 694. Vop. 2. Spr. 1740.

18. NHAB. – F. 694. Vop. 2. Spr. 6055.

19. NHAB. – F. 147. Vop. 3. Spr. 12148.

20. Historyja Bielarusi : u 6 t. / redkal.: M. Kasciuk (hal. red.) [i insh.]. – Minsk : Ekapierspiektyva, 2000–2011. – T. 4 : Bielarus' u skladzie Rasijskaj impieryi (kaniec XVIII – pachatak XX st.) / M. Bich [i insh.]. – 2005. – 519 s.

21. NHAB. – F. 242. Vop. 2. Spr. 1565.

22. NHAB. – F. 242. Vop. 2. Spr. 825.

23. NHAB. – F. 242. Vop. 2. Spr. 770.

24. NHAB. – F. 242. Vop. 2. Spr. 758.

25. NHAB. – F. 694. Vop. 2. Spr. 5626.

26. NHAB. – F. 147. Vop. 3. Spr. 30909.

27. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – Zespół 354. Dział XI. Sygnatura 305.

28. NHAB. – F. 147. Vop. 3. Spr. 31332.

29. Dziarzhauny arkhiu Bresckaj voblasci. – F. 2031. Vop. 2. Spr. 2568.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 03.03.2023*